*Энгельс Дарашэвіч*

# ЗІНАІДА МАЖЭЙКА І «ПЕРЫЯД СІСТЭМ» У БЕЛАРУСАЗНАЎСТВЕ

Напярэдадні сённяшняй канферэнцыі, 14 сакавіка бягучага года ў Беларускім дзяржаўным ўніверсітэце культуры і мастацтваў адбыўся «круглы стол», прысвечаны памяці беларусазнаўца, этнамузыколага і аўдыявізуальнага антраполага Зінаіды Мажэйкі (мал. 1). Кола пытанняў, што ўзнімалі яго арганізатары (прадстаўнікі ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Студэнцкага этнаграфічнага таварыства, калегі і сябры даследчыцы) было наступным: навуковая спадчына даследчыцы; захады па ўшанаванні яе памяці; сучасны стан этнічнай культуры беларусаў і захаванне экалогіі традыцыйнай культуры паводле навуковага тэстаменту Зінаіды Мажэйкі. Тое, што прадстаўнікі абсалютна розных навуковых, адукацыйных і грамадскіх устаноў сабраліся разам менавіта па вышэйназванай нагодзе, падаецца заканамерным, сімвалічным і надта своечасовым. Асабліва своечасовай бачыцца сустрэча, згаданая вышэй, калі «ўзважыць»: спецыфіку ўнёску нашай вядомай суайчынніцы ў беларусазнаўства і сусветную навуку; яе асабістыя якасці і жыццёвае крэда; а таксама сучасны стан аб’екта яе навуковых і грамадскіх інтарэсаў, якому была цалкам прысвечана ўсё жыццё – сучасны стан традыцыйнай культуры беларусаў.



*Малюнак 1 –* Зінаіда Мажэйка з майстрыхай палескіх тонежскіх спеваў Ганнай Венгурай, 1970-я.




*Малюнак 2 –* Праграмнае даследаванне па экалогіі фальклору, 2011 [3].

З Зінаідай Мажэйкай мяне пазнаёміў філосаф Уладзімір Конан у 1957 годзе. Па сканцэнтраванасці на інтэлектуальных і культурных каштоўнасцях, ігнараванні ўсяго мяшчанскага і ўтылітарнага Зінаіда Якаўлеўна была рафінаванай «шасцідзясятніцай», такіх людзей зараз «не робяць»… Сярод яе сяброў заўсёды былі вядучыя навукоўцы і дзеячы культуры. Менавіта шырокае кола зносін і высокі накал інтэлектуальнага жыцця дазволілі ёй бліскуча спалучыць беларусазнаўства з паняційным апаратам высокай навукі, адэптам і служачым якой яна сябе лічыла. Зінаіда Мажэйка была прадстаўніком сістэмна-тыпалагічнай інтанацыйнай школы пецярбуржца Яўгена Гіпіуса (ў этнамузыкалогіі) і сацыякультурна-антрапалагічнай школы эстонца Ленарта Мэры (у этнакінематаграфіі); з’яўлялася сябрам саюзаў кампазітараў, кінематаграфістаў, музычных дзеячаў Беларусі; сябрам міжнародных камісій IOV, Амерыканскага біяграфічнага інстытута, Інтэрнацыянальнага біяграфічнага цэнтра ў Кембрыджы. Кембрыдж, дарэчы, уключыў яе ў спіс «200 вядучых жанчын-інтэлектуалаў свету» і «2000 выбітных інтэлектуалаў XXI стагоддзя».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




*Малюнак 3* – Пячатка Інстытута антрапалогіі археалогіі і этнаграфіі на беларускіх матэрыялах Я.Гіпіуса, 1930-я.



*Малюнак 4* – З.Мажэйка і яе савецкія калегі з этнамузыколагамі і антраполагамі ЗША, Нью-Ёрк, 1989.

Рубяжы, якіх беларусазнаўства сёння дасягнула, Мажэйка прадбачыла. Фальклор нашага народа сёння даследаваны і пажанрава, і парэгіянальна, і ў зрэзе «жывога бытавання» традыцый. *Пажанрава* ён апісаны ў 50-томным зборы «Беларуская народная творчасць» ІМЭФ НАН Беларусі; *парэгіянальна* – ў шматтомным фальклорным зборы «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў», аўтарскі калектыў якога на чале з вучаніцай Мажэйкі Тамарай Варфаламеевай атрымаў сёлета спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва; у *зрэзе «жывога бытавання»* – наша фальклорная традыцыя фіксуецца на інтэрнэт-партале livingheritage.by, кантэнт якога фарміруюць рэгіянальныя ўстановы культуры пры падтрымцы Інстытута культуры Беларусі. Цікавыя і паказальныя (ў кантэксце тэмы майго выступу) сама гісторыя падрыхтоўкі і змест гэтых збораў. Іх пачыналі фарміраваць і выдаваць (збор «БНТ») – у асноўным філолагі і музыказнаўцы; потым (у зборы «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў») – ужо далучыліся этнахарэолаг, спецыялісты па ДПМ, традыцыйным касцюме, этналогіі і мультымедыя; ну а сёння (на інтэрнэт-партале livingheritage.by) – выкладзеныя відэазапісы элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якія, такім чынам, можна непасрэдна комплексна ўспрыняць як прасторава-часавую рэчаіснасць. Так, сёння інфармацыя пра традыцыйную культуру – у наяўнасці, яна – ёсць, але ў грамадстве дагэтуль НЯМА дакладнага разумення, як з гэтай інфармацыяй працаваць: ні канцэптуальна, ні ўжыткова-тэхнічна… Таму – бясспрэчна: задачы і пажаданні аб лёсе фальклору, якімі «хварэла» Зінаіда Мажэйка, могуць быць вырашаны толькі сумеснымі намаганнямі ўсіх беларусаў. А задача яе сяброў і вучняў – намацаць пералік захадаў і мадэляў дзейнасці па дасягненні «экалагізацыі свядомасці нашага грамадства ў дачыненні да аўтэнтычных форм фальклору» [3], да чаго заклікала Мажэйка ў сваіх апошніх працах (мал. 2).

Падаецца, з пазіцый беларусазнаўства XXI стагоддзя бясспрэчна наступнае: сама постаць Мажэйкі-даследчыка і Мажэйкі-грамадскага дзеяча; яе поўны змагання і трагічнай пасіянарнасці лёс; навуковы тэстамент, сфармуляваны ў кнігах, фільмах і аўдыёзапісах і паслядоўна выконваемы шэрагам яе вучняў і паслядоўнікаў – ўсё гэта недвухсэнсоўна сведчыць: толькі *сістэмны* падыход да культурнай спадчыны нашага народа можа даць хоць крыху *адчувальны плён у захаванні традыцый, культуры і самой антрапалагічнай,* выбачайце, *папуляцыі беларусаў*. Так, наша пастаянная і пільная ўвага да Зінаіды Мажэйкі тлумачыцца вельмі проста: яна як надзвычай успрымальны і сумленны чалавек сапраўды спачатку *прадбачыла*, потым *прачула*, і, можна сказаць, нават *выпакутавала* непазбежнасць надыходу *перыяду сістэм* у беларусазнаўстве, які сёння ўсім нам *жыццёва неабходны*. Як яна яго бачыла ці, хутчэй, адчувала? Пытанне, вядома, дыскусійнае, але, калі звярнуцца да яе твораў і некаторых абставін біяграфіі – не невырашальнае.

Справа ў тым, што разуменне глабальнасці традыцыйнай спадчыны для выжывання кожнага народа доўга, але няспынна выспявала ў асяроддзі прадстаўнікоў этнамузыказнаўчых школ школ былога СССР. Яно знайшло выхад у дзейнасці Усесаюзнай камісіі па народнай музычнай творчасці (створана ў 1972 г.) і буйных планах па стварэнні Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута музычнага фальклору [1, с. 190-191], якія не паспелі ажыццявіцца, паколькі пасля 1991 г. фалькларысты краін былога СССР былі вымушаныя змагацца за фальклор кожны паасобку. Маючы фантастычны «нюх» на ўсё новае і актуальные ў навуцы, Мажэйка брала ў вышэйназваных захадах вельмі актыўную ролю, як і яе настаўнік Яўген Гіпіус, які дасканала даследаваў

РЕПОЗИТОРИЙ Б

беларускую традыцыю яшчэ ў 1930-х. Прычым, даследаваў ён беларусаў як прадстаўнік Інстытута *антрапалалогіі,* археалогіі і этнаграфіі (мал. 3). У адной са сваіх праграмных кніг «Каляндарна-песенная сістэма Беларусі» [2] (абсалютным бестсэлеры 1980-х у асяродку айчыннай інтэлектуальнай эліты) Мажэйка з першых старонак недвухсэнсоўна падкрэсліла, што для якаснага вывучэння фальклору «неабходныя экспедыцыі сацыялагічнага напрамку са стацыянарным даследаваннем найбольш спеўных вёсак метадам «уключанага назірання» (па тэрміналогіі сацыёлагаў)» [2, с. 10]. Гэта значыць – з выкарыстаннем асноўнага метаду англамоўных *сацыякультурных антраполагаў* («заходніх сацыёлагаў» у айчынных выданнях часоў СССР).

Не завочна, а непасрэдна пазнаёмілася яна з антраполагамі толькі ў 1980-х, падчас візіту ў ЗША – краіну, дзе народазнаўства не «расцягваюць» па «асобных кватэрах» філалогіі, мастацтвазнаўства, сацыялогіі і эстэтыкі, а займаюцца ім комплексна – як антрапалогіяй (навукай пра чалавека і культуру – якая яго чалавекам, уласна, і робіць). Асабістае знаёмства з многімі прадстаўнікамі антрапалогіі (мал. 4) сфарміравала ў Зінаіды Мажэйкі думкі, якімі яна ўвесь час дзялілася ў прыватных размовах, а ў апошніх эдыцыях пазначала як «адвакацкую функцыю фалькларыстаў» [1, с. 236] у барацьбе за захаванне традыцыйнай культуры з яе апанентамі, якія ва ўсім свеце перыядычна па-фарысейску апранаюцца ў «рызы» прагрэсістаў і прыхільнікаў няспыннай мадэрнізацыі грамадства (часам – не разумеючы законаў, па якіх гэтае грамадства жыве, і прыроды чалавека). Зінаіда неаднаразова казала і мне, і Уладзіміру Конану наступнае: «Як змагаліся за захаванне культуры абарыгенаў амерыканскія і еўрапейскія антраполагі, так і я – усё жыццё змагалася за прызнанне і павагу да аўтэнтычнага фальклору беларусаў…». Безумоўна – для нас гэта прыклад, і прыклад, варты пераймання… Вядома, дасканаласць даследчых методык сацыякультурнай антрапалогіі, вынікі даследчай і грамадскай дзейнасці яе прадстаўнікоў не маглі не ўразіць Мажэйку. Яна гэта неаднаразова падкрэслівала, вітала, падтрымлівала і грамадскія ініцыятывы па захаванні фальклору (дзейнасць Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Студэнцкае этнаграфічнае таварыства»), і комплексны, антрапалагічны падыход да народнай творчасці, які ў пачатку стагоддзя фарміраваўся ў практычнай фалькларыстыцы Беларусі, і звязаны з пераймannем фальклору метадам дэманстратыўнай антрапатэхнікі. Так, яна была першай з вядомых у Еўропе навукоўцаў, хто стаў на абарону кафедры этналогіі і фальклору нашага ўніверсітэта, якая першая ўвяла такія методыкі ва ўніверсітэцкае навучанне, а адбылося гэта ў вельмі няпросты для кафедры час.

Адчуванне комплекснасці, сістэмнасці і антрапалагічнага аспекту беларусазнаўчай спадчыны доктара мастацтвазнаўства Зінаіды Мажэйкі «лунала» і над удзельнікамі вышэйзгаданага сёлетняга «круглага стала», сабранага ў яе гонар. Падчас яго сваімі думкамі пра спадчыну Зінаіды Мажэйкі, справаздачамі па апрацоўцы архіва даследчыцы падзяліліся прафесар Аляксей Рагуля, доктар філалагічных навук Арсень Ліс, старшыня СЭТ Аляксей Глушко, журналіст і аўтар антрапалагічных фільмаў Рэгіна Гамзовіч, філолаг Рыма Кавалёва, этнамузыколаг Валянціна Яшчанка, прарэктар БДУКМ Віктар Языковіч, культуролаг Вячаслаў Калацэй, кіраўнікі фальклорных калектываў Уладзімір Зяневіч і Ларыса Рыжкова і іншыя спецыялісты. Пасля выступаў удзельнікамі «круглага стала» быў унесены шэраг прапаноў. Выдатна, што памяць Мажэйкі будзе ўшанавана ў назве канферэнцыі, якую ладзіць універсітэт культуры і мастацтваў: *Навуковая канферэнцыя «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання» памяці антраполага Зінаіды Мажэйкі.* Аднак, па агульным меркаванні, сёння неабходна прапанаваць: НАН Беларусі – разгледзець пытанне выдання збору твораў даследчыцы, прымеркаванае да яе наступнага юбілею; Саветам БДУ, БДУКМ, БДАМ – прызначаць іменную стыпендыю імя Зінаіды Мажэйкі студэнтам, якія праявілі сябе ў аўдыявізуальнай антрапалогіі; Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь ў межах Міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» – уручаць «Спецыяльны прыз імя Зінаіды Мажэйкі за лепшы ўсходнееўрапейскі этнаграфічны фільм сезону»; Белдзяржтэлерадыёкампаніі – актыўна далучаць экспертаў-прафесіяналаў да планавання і стварэння спецыялізаваных тэлепраграм пра фальклор. Гэта – патрабаванні часу і самае малое, што можна зрабіць у памяць пра нашу вядомую суайчынніцу, якая і сёння сваім тэстаментам у шматлікіх эдыцыях набліжае айчынную навуку да «перыяду сістэм» у беларусазнаўстве, без якога беларусам будзе надта цяжка, нават – немагчыма.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс літаратуры:**


1. Белорусская этномузыкология: очерки истории (XIX – XX вв.) / З. Можейко, Т. Якименко, Т. Варфоломеева и др. ; под.ред. З. Можейко. – Минск : Наука и техника, 1997. – 254 с.
2. Можейко, З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии : опыт систем.-типол. исслед. / З. Я. Можейко. – Минск : Наука и техника, 1985. – 247 с.
3. Можейко, З.Я. Экология традиционной народно-музыкальной культуры: нематериальная культура Беларуси в свете социально-экологических проблем / З. Я. Можейко. – Минск: Беларус. навука, 2011. – 147 с.